Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкавіцкі навучальна – педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Машыны на нашай вуліцы
Канспект гутаркі ў першай рознаўзроставай групе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: фарміраванне ўяўлення пра транспарт, які часцей дзеці бачаць на вуліцах; развіццё умення адрозніваць па знешнім выглядзе і называць грузавы і легкавы транспарт; развіццё камунікатыўных навыкаў і сяброўскіх ўзаемаадносін.

Выхаванне любові да роднага аграгарадка.

Матэрыял: розныя віды машын, лялькі, цацкі-звераняты, малюнкі, фатаграфіі, ілюстрацыі з выявай транспартных сродкаў.

Ход гутаркі:

Скажыце мне, дарагія дзеткі, як называецца вёска, у якой вы жывяце?

А хто ведае, на якой вуліцы вы жывяце?

Ваш дом вялікі ці маленькі?

З кім вы жывяце?

Куды вы ходзіце з бацькамі?

Якія машыны ездзяць па вашай вуліцы?

Паслухайце, я вам загадаю загадку, а вы мне скажаце адказ.

“Чатыры колы, гумовыя шыны, матор і тормазы...што гэта? (машына)

Так, вы маеце рацыю, гэта машына. Кожная машына называецца па-рознаму. (Выхавальнік паказвае дзецям цацачныя машыны: грузавы і легкавы аўтамабілі, аўтобус)

Ва ўсіх машын ёсць кабіна, рухавік, колы, руль, сядзенні для кіроўцы і пасажыраў. Праверце, у ці ўсіх вашых машын ёсць гэтыя дэталі. (Дзеці разглядаюць машыны, называюць іх дэталі)

А што павінна быць у машын, каб у яе маглі зайсці шафёр і пасажыры? (дзверы)

Ва ўсіх машын ёсць дзверы? Каб паглядзець з машыны на вуліцу, што ў ёй павінна быць?(акно)

А кузаў ёсць ва ўсіх машын? Правільна, кузаў ёсць толькі ў грузавога аўтамабіля, у ім шафёр перавозіць розныя грузы: пясок, зямлю, будаўнічы матэрыял, гародніну і садавіну, мэблю.

Каго перавозіць аўтобус? (пасажыраў, людзей)

Колькі сядзенняў у аўтобусе? А ў легкавым аўтамабілі? (шмат-мала)

Рэфлексія

Дзеці, а вы б хацелі паехаць у вясёлую паездку? Куды мы паедзем? На чым мы паедзем? Куды ўваходзіць шмат пасажыраў? Правільна ў аўтобус. Давайце пабудуем аўтобус з крэселкаў. (Дзеці з дапамогай выхавальніка будуюць аўтобус, выбіраюць шафёра.) Дзеці і выхавальнік садзяцца ў аўтобус, шафёр імітуе рух руля, дзеці-шум матора.

Выхавальнік у працэсе гульні ўключае музыку С. Міхалкова «Песенька сяброў». Разам з дзецьмі могуць паехаць лялькі.

Вось як добра, весела мы праехалі на аўтобусе, а цяпер вы сваіх лялек і звярацъ пакатайце на машынах.